*Л.Г. Дуктава*

# АСАБЛІВАСЦІ АДЛЮСТРАВАННЯ МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫХ КАНФЛІКТАЎ У АПОВЕСЦІ "ЗАВІХРЭННЕ" І. ШАМЯКІНА

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1997 годзе І. Шамякін напісаў аповесць "Завіхрэнне". Герой твора Алег Журковіч – нявінна асуджаны чалавек, які выйшаў з зоны. Турма падзяліла яго жыццё на дзве паловы. Да таго, як папаў сюды, гэта быў малады архітэктар, закаханы ў Рагнеду. Разам з бядой, выкліканай смерцю любімай дзяўчыны, няўмольны лёс прынёс большае гора: яго абвінавацілі ў забойстве Рагнеды. Адсутнасць алібі, выпадкова ляжаўшая ўжо колькі часу акрываўленая насавая хустачка з Рагнедзінай кроўю ды дзённікавы запіс дзяўчыны – усяго гэтага хапіла для таго, каб "прышыць дзела" і вынесці смяротны прыгавор Журковічу. Але пазней гэтае пакаранне замянілі на турэмны тэрмін і яго адправілі на этап – у далёкі Нарыльскі катаржны лагер. Наступны перыяд пачаўся з сямі гадоў пакут у турме. Папярэднія падзеі жыцця – смерць каханай, абвінавачванне яго ў яе забойстве – перараслі ў вялікі душэўны боль, з якім Журковічу давялося жыць і падчас турэмнага заключэння, і пасля так званай рэабілітацыі, калі стала вядома, што Рагнеда стала ахвярай серыйнага маньяка.

У першыя дні пасля вызвалення Алег пабываў на магіле каханай дзяўчыны, паабяцаўшы пакараць вінаватых. Пісьменнік ставіць свайго героя перад выбарам: здзейсніць пакаранне, якое абяцаў выканаць перад магілай любімай дзяўчыны, ці адмовіцца ад помсты. Такая сітуацыя маральнага выбару прысутнічала і раней у шамякінскай прозе. У першай аповесці Шамякіна "Помста" (1946) маёр Раманенка знаходзіцца перад выбарам: выканаць апошні наказ жонкі і адпомсціць сям'і ката ці прабачыць, дараваць ім. У гэтай складанай сітуацыі высокая чалавечнасць героя перамагае прагу помсты.

З аднаго боку, Алег Журковіч дарue суддзі Фросі Абабурцы. Прыйшоўшы да яе дадому, ён заўважае, што яна змянілася, нядобра выглядае, пастарэла, да таго ж у яе сям'і гора – унук-інвалід. Журковіч скасаваў абяцанне, бо не паступіўся сваімі высокамаральнымі прынцыпамі. З другога боку, інакш Алег паводзіць сябе з Загадаем, ад якога патрабуе маральнай кампенсацыі. Пракурор адплачваецца дачай, але пазней само жыццё вымушае заплаціць былога пракурора большую цану за сваё маральнае падзенне – стратай сына.

У аповесці "Завіхрэнне" пісьменнік адлюстроўвае жыццёвыя сітуацыі як бы на мяжы. Гэта мяжа выбару паміж пакараннем і дараваннем, мяжа паміж каханнем і забойствам, мяжа паміж свабодным жыццём і існаваннем за кратамі. Пісьменнік з розных бакоў падыходзіць да асэнсавання маральных праблем грамадства. Празаік паказвае розныя вымярэнні паняцця норм жыцця, няпісаных правіл, якіх прытрымліваюцца людзі. Герой аповесці аказваецца як бы ў гушчы маральна-этычных канфліктаў.

Па-першае, з нормамі грамадскага жыцця не супадалі правілы, занатаваныя на зоне: *"Там былі дзіўныя законы маралі. Паважалі забойцаў"* [2, с. 487]. Пісьменнік вымушае чытача пaглядзець на жыццёвыя сітуацыі вачыма людзей, якія прайшлі праз зону. Але ні Алег Журковіч, ні Іван Ціхотка не сталі прапашчымі злачынцамі. Яны прынеслі з-за кратаў толькі лексікон ды мянушкі, але не філасофію і мараль турэмнага жыцця.

Па-другое, гутарка ідзе пра ўрайнаванне матэрыяльнага дабрабыту грамадзян савецкай краіны: *"Але такое было выхаванне: за бедных, супраць багатых"* [1, с. 483]. У той жа час герой адчувае, што такая пазіцыя не можа стаць для яго маральным стрыжнем: *"Экспрапрыяцыя экспрапрыятараў – выдатная ленінская формула! – прывабная акцыя. Але ён* [Журковіч. – *Л.Д.*] *гэта рабіць не ўмее і не можа па сваіх маральных прынцыпах"* [1, с. 491].

Па-трэцяе, іншы погляд на паняцце маралі прынёс новы гістарычны час, калі адбылася ломка старых прыярытэтаў: *"Былыя высокія маралісты, заканадаўцы, ахоўнікі парадку, суддзі і пракуроры, ператварыліся ў яўных легальных зладзеяў. <...> Заводы, магазіны, рэстараны прысвойваюць з незвычайным спрытам, прыдумаўшы апраўдальнае слова –* ***прыватызацыя*** [выдзелена І. Шамякіным. – *Л.Д.*]. *Недарэмна народ яе называе прыхватызацыяй"* [1, с. 490].

І ўсё ж для таго, каб змагацца з новымі бедамі, стаўка зноў-такі робіцца на вечныя каштоўнасці, народнае публічнае абвінавачванне: *"Пры*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*сённяшняй дэмакратыі можна наладзіць шумны суд, усе газеты распішуць. Калі Загадай і Абабурка не дурні, яны пабаяцца такога суда: гэта паставіць крыж на іх кар'еры"* [1, с. 491–492].

І, нарэшце, па-чацвёртае, учынкі і паводзіны ў творы ацэньваюцца з гуманістычна-хрысціянскай пазіцыі: *"Слова "Чалавек" трэба пісаць з вялікай літарары, як і "Бог""* [1, с. 470]. Дарэчы, такая светапоглядная пазіцыя з'яўляецца даволі блізкай герою аповесці Алегу Журковічу: *"Быў атэістам, ніякіх малітваў не ведаў. Але маліўся бяссонымі начамі. Прасіў Бога, і Бог заняў бадай усё месца ў яго спустошанай душы"* [1, с. 553].

Менавіта гэты гуманістычна-хрысціянскі пачатак перамагае ў аповесці, якая заканчваецца хэпі-эндам: хворая дзяўчынка Хрысціна папраўляецца, Загадай падаў у адстаўку, аформіў дачу на Журковіча, які ажаніўся з Ірэнай. Апошні радок твора змяшчае хрысціянскую цытату: *"Не наступае "мир на земле и в человецах благоволение""* [1, с. 589].

Такім чынам, аповесць "Завіхрэнне" – твор шматаспектны. Пісьменнік вымушае чытача паглядзець на ўчынкі герояў, праблемы, якія падымаюцца ў творы, з розных ракурсаў. Мо таму складанасць адлюстраваных у творы тэм, амбівалентнасць герояў вымагаюць ад творцы стварэння сінкрэтычнага твора, які мае і эмацыйную афарбоўку, і псіхалагічныя рысы, і аналітычны пачатак, і дэтэктыўныя рысы, і характэрны для ўтапічнага твора хэпі-энд.

## Літаратура

1. *Шамякін, І.* Палеская мадонна: аповесці / І. Шамякін. – Мінск: Юнацтва, 1998. – 590 с.

ектронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешо